Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-02-12



# Кніжнае свята скончылася — кніга не скончыцца ніколі

**Пазаўчора, 10 лютага, юбілейная ХХ Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш завяршыла сваю работу. Падводзячы вынікі форуму пасля ўрачыстай цырымоніі яго закрыцця, першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч падкрэсліла, што галоўнае заключалася не ў колькасці праведзеных мерапрыемстваў (а іх на ХХ ММКВК прайшло 270), а ў тым, што наша краіна яшчэ раз прадэманстравала найвышэйшы ўзровень нацыянальнай кніжнай культуры, беларускай духоўнасці і дзяржаўнасці. "Наша духоўная культура, духоўная спадчына сёння ўзведзены ў ранг дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі і ідэалогіі", — адзначыла Лілія Станіславаўна.**



Міністр адукацыі Сяргей Маскевіч падчас наведвання "Адукацыйнага квартала".

Безумоўна, ХХ Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш, якая доўжылася пяць дзён і, паводле папярэдніх падлікаў, сабрала больш за 50 тысяч наведвальнікаў, была найперш святам кнігі, а ўжо потым — пляцоўкай для дыскусій, сустрэч, круглых сталоў і іншых спадарожных мерапрыемстваў. Кірмаш жа на тое і ёсць кірмаш, каб на ім куплялі і прадавалі. Не хочацца памыліцца, але, здаецца, знайшлося б зусім няшмат тых наведвальнікаў сёлетняй Мінскай МКВК, якія б не прыдбалі на ёй хаця б адну кніжку. А былі ж і тыя, хто выходзіў з будынка НВЦ "БелЭкспа" з цэлымі валізкамі набытых там кніг. Купіць кнігу на юбілейным кніжным форуме — гэта трохі іншае, чым купіць яе ж у звычайны дзень у кнігарні, і справа — не толькі ў крыху меншым кірмашовым кошце. Кнігі — гэта ўспаміны аб кніжных кірмашах, тое галоўнае, што ў прынцыпе ад іх застаецца. Скажам, на маёй хатняй кніжнай паліцы сёння на самым бачным месцы размясціліся менавіта яны, жывыя "ўспаміны" ХХ ММКВК: першы беларускі раман (як пазіцыянуюць гэты твор супрацоўнікі сталічнага выдавецтва "Рэгістр") "Сярод балот і лясоў" Якуба Брайцава, зборнік літаратурных эсэ "Сечка" Андрэя Федарэнкі, складзеная Язэпам Янушкевічам анталогія "Тварам да шыбеніцы" (Кастусь Каліноўскі і паўстанне 1863—1864 гадоў у беларускай паэзіі), сёе-тое яшчэ... Гэта быў мой выбар пакупніка і чытача, і я не шкадую. Дарэчы, усе аўтары, акрамя, натуральна, Якуба Брайцава (1861—1931), свае кнігі мне падпісалі. Гэта таксама каштуе дарагога.



Аўтограф-сесія паэта Уладзіміра Мазго: дзецям дужа цікава!

Аднак жа, пяройдзем да агульных акцэнтаў. Глабальная прысутнасць Расіі ў якасці ганаровага госця ХХ Мінскай ММКВК адчувалася не толькі ўнутры НВЦ "БелЭкспа", дзе праходзілі прэзентацыі асобных выданняў (чаго вартая, напрыклад, толькі двухмоўная анталогія "Славянская паэзія XX—XXI. З веку ў век" — пераможца Нацыянальнага конкурсу выдаўцоў Расіі "Книга года — 2010" у намінацыі "Белые росы"!) і выдавецкай праграмы маскоўскага ўрада "Масква кніжная", але нават і... на беларускім тэлеэкране, калі ў нядзельнай перадачы "Клуб рэдактараў" разам з кіраўнікамі айчынных СМІ браў удзел вядомы расійскі публіцыст намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Наш сучаснік" Аляксандр Казінцаў. Адначасова і мудрасць, і душэўнасць, і шчырая павага да суседняга народа адчуваліся ў яго развагах, магчыма, у нечым нават — белая добрая зайздрасць. Што да практычных вынікаў удзелу Расійскай Федэрацыі ў нашым кніжным форуме, то трэба, мабыць, найперш адзначыць: каля 2 тысяч кніг з нацыянальнага расійскага стэнда і экспазіцыі "Масква кніжная" перададзены беларускім бібліятэкам. Гэта і навуковая літаратура, і кнігі для дзяцей, і літаратурная класіка, і грунтоўныя выданні, прысвечаныя 200-годдзю вайны 1812 года ды 70-годдзю Сталінградскай бітвы. Дарэчы, калі ўжо казаць пра падарункі, дык, па традыцыі, не абышлося і без прыемных сюрпрызаў ад пасольства Германіі. Сёлета значнымі аб'ёмамі літаратуры на нямецкай мове папоўніліся бібліятэчныя і метадычныя фонды бабруйскай сярэдняй школы № 27, гомельскай сярэдняй школы № 49 і віцебскай сярэдняй школы № 45.

Напэўна, ніколі яшчэ за ўсю гісторыю правядзення мінскага кніжнага форуму не гаварылася на ім так многа і канкрэтна пра электроннае кнігавыданне. Пра гэта разважаў міністр адукацыі Беларусі Сяргей Маскевіч, калі наведваў павільён "Адукацыйны квартал", у прыватнасці, пра тое, што ў найбліжэйшай будучыні асноўныя курсы ва ўстановах вышэйшай адукацыі будуць прапаноўвацца на электронных носьбітах. Пра гэта, падводзячы вынікі ХХ ММКВК, гаварыла і першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч: "Мы прыйшлі да высновы, што сёння важна больш займацца электронным кнігавыданнем, каб не ўпусціць момант старту, калі электронная кніга павінна будзе ўвайсці ў яшчэ больш шырокае карыстанне".

Дарэчы, павільён "Адукацыйны квартал" таксама вельмі важнае новаўвядзенне сёлетняй выставы-кірмашу. Па сутнасці, была створана адзіная прэзентацыйная прастора выдавецкай дзейнасці ў сістэме адукацыі Беларусі, дзе свае найноўшыя напрацоўкі змаглі паказаць як вялікія спецыялізаваныя выдавецтвы кшталту "Адукацыя і выхаванне" і "Пачатковая школа", так і выдавецкія структуры Нацыянальнага інстытута адукацыі, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, асноўных беларускіх устаноў вышэйшай адукацыі. Сяргей Маскевіч на выставе выказаў думку пра тое, што гэтым выдавецкім структурам неабходна больш актыўна прымаць удзел у міжнародных выставачных праектах, асабліва ў краінах СНД. У прыватнасці, распрацоўкі макетаў вучэбнай літаратуры запатрабаваны ў многіх краінах былога СССР, і выдавецтвы Міністэрства адукацыі павінны больш актыўна рэкламаваць там свае магчымасці. Яшчэ адзін важны вектар пашырэння маштабаў выдавецкай справы ў галіне адукацыі — Кітай. Па словах Сяргея Маскевіча, на сённяшні момант у беларускіх вытворцаў кніжна-часопіснай прадукцыі, вучэбнага кнігавыдання слаба развіты маркетынгавы складнік. Але калі наша вышэйшая адукацыя запатрабавана ў КНР, калі да нас едуць вучыцца кітайскія студэнты, значыць, і там неабходны беларускія падручнікі і вучэбныя дапаможнікі.

Наогул, ХХ Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш яшчэ раз яскрава прадэманстравала відавочную тэндэнцыю на выдавецкім рынку пачатку стагоддзя — усё большую ўвагу аўтараў і выдаўцоў да вучэбнай, навуковай і навукова-папулярнай літаратуры, разлічанай найперш на тых, хто вучыць і вучыцца. Адпаведна менавіта такіх кніжных прэзентацый на сёлетнім форуме было найбольш, нават прыблізны пералік заняў бы ці не палову газетнай паласы. Але для ілюстрацыі хаця б адзін яркі прыклад.

Выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" прэзентавала на форуме чацвёрты том з 12-томнай серыі "Энцыклапедыі для школьнікаў і студэнтаў" — "Свет тэхнікі". Як вядома, гэтая серыя выходзіць з 2009 года пад агульнай рэдакцыяй доктара фізіка-матэматычных навук прафесара БДУ В.І.Стражава, а ў стварэнні яе прымаюць удзел вядучыя навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, галіновых НДІ, БДУ, БДУІР і іншых устаноў вышэйшай адукацыі. Па сутнасці, ініцыятары і аўтары праекта аднавілі добрую старую традыцыю выдання галіновых энцыклапедый для моладзі, на постсавецкай прасторы аналагаў гэтых кніг няма.

Чацвёрты том "Свет тэхнікі" складаецца з сямі раздзелаў: "Матэрыялы і тэхналогіі", "Энергетыка", "Інструменты, прылады, механізмы і машыны", "Тэхнічная фізіка. Радыёэлектроніка. Вымяральная і вылічальная тэхніка", "Транспарт", "Будаўніцтва" і "Авіяцыйная і касмічная тэхніка". Кожны з раздзелаў пачынаецца з уступнага артыкула аднаго са складальнікаў тома. Пра актуальнасць жа асноўнага зместу сведчаць вышэйпералічаныя назвы. Асабліва істотна тое, што ў кнізе падаецца падрабязная інфармацыя з гісторыі тэхнікі ў Беларусі, у прыватнасці, пра тое, якія матэрыялы і механізмы былі вынайдзены ў нашай краіне.

З нагоды выхаду тома ў свет адбыўся круглы стол на тэму "Свет тэхнікі ў Беларусі: ад існуючага да ўзнікаючага" з удзелам аўтараў-вучоных. Трэба было бачыць, як радаваліся яны свайму нованароджанаму папяроваму дзіцяці і як былі заклапочаны тым, каб кніга дайшла да маладога чытача. Напрыклад, рэдактар тома, прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук фізічнага факультэта БДУ Мікалай Паклонскі назваў маладых людзей не толькі мэтавай аўдыторыяй выдання, але і галоўнай надзеяй беларускай навукі. Прафесар загадчык кафедры метралогіі і стандартызацыі БДУІР Аляксандр Гурскі асабліва падкрэсліў унікальнасць тома — пад адной вокладкай тут сабраны праўдзівыя і шматразова правераныя даныя пра самыя апошнія адкрыцці і новыя тэхналогіі ў галіне тэхнічных і прыродазнаўчых навук. А яшчэ, па словах прафесара, кніга будзе вельмі карыснай для самаадукацыі, паколькі шырокі кругагляд, цікавасць не толькі да "сваёй" галіны, але і да сумежных сфер навукі дазваляе штогод рабіць тысячы адкрыццяў, вынікамі якіх карыстаецца сёння чалавецтва. Алег Пенязькоў, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дырэктар акадэмічнага Інстытута цепла- і масаабмену, акрэсліў асноўны спіс праблем адукацыі ў сферы энергетыкі і магчымыя шляхі іх вырашэння, заўважыўшы, што том "Свет тэхнікі" дасць школьнікам базавыя арыенціры для больш глыбокага вывучэння гэтай цікавай складанай тэмы. На думку прарэктара БДУ па вучэбнай рабоце Аляксея Тоўсціка, адной з галоўных праблем падрыхтоўкі навуковых кадраў у сферы энергетыкі з'яўляецца сыход высакакласных спецыялістаў пакалення СССР і адсутнасць дастойнай замены ім сярод выпускнікоў тэхнічных устаноў вышэйшай адукацыі. А.Тоўсцік выказаў меркаванне, што каб забяспечыць неабходны ўзровень развіцця навукі ў краіне, каля 30 працэнтаў выпускнікоў павінны станавіцца магістрамі. Таксама ён падзяліўся з прысутнымі навінай пра тое, што ў наступным годзе плануецца адкрыць 11 новых прыродазнаўчых спецыяльнасцей у беларускіх установах вышэйшай адукацыі, а ў расклады школьных прадметаў вярнуць гадзіны фізікі і матэматыкі, якіх не хапае.

Словам, сур'ёзная атрымалася размова, нагодай для якой стала ўсяго толькі адна, хай і грунтоўная, кніга. ХХ Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш скончылася, а гутаркі пра кнігі не скончацца. І сама кніга ніколі не скончыцца. Мінскі кніжны форум, цікавасць чытачоў да яго дазволілі ў гэта паверыць.

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
**Фота БелТА.**

## Прагноз надвор'я

Сёння днём па Беларусі чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Пераважна па паўночна-ўсходняй палове снег, мокры снег. Па паўднёвым захадзе месцамі туман, шэрань. На дарогах захаваецца галалёдзіца. Вецер усходні 4—9 м/с. Максімальная тэмпература паветра -2 — +3°С.

У наступныя двое сутак па краіне будзе воблачна з праясненнямі. Месцамі кароткачасовы снег, мокры снег. У асобных раёнах туман, шэрань, на дарогах галалёдзіца. Вецер усходні 4—9 м/с. Тэмпература паветра мінімальная ноччу 0 — -7°С, пры праясненнях да -8 — -13°С, максімальная днём -4 — +3°С.

**Рэспубліканскі гідраметэацэнтр.**

ISSN 1994-9146
9 771994 914000 13017

Галоўны рэдактар Вадзім Кнышаў

Мікола Чэмер. Кніжнае свята скончылася – кніга не скончыцца ніколі